ТЭЛЕПРАГРАМА НА НАСТУПНЫ ТЫДЗЕНЬ – на 3-й старонцы

Свабода, роўнасць, братэрства!



# Беларускі УСХОД

ЖЫВЕ БЕЛАРУСЬ!
НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ДЭМАКРАТЫЧНАЯ ГАЗЕТА

● Заснавана ў 1991 годзе ● № 7 (63) ● Субота, 14 жніўня 1999 г. ● У розніцу кошт 10000 руб.

## НАВІНЫ, ПАДЗЕІ, ФАКТЫ

### ЗАТРЫМКІ НА ЖНІВЕ З-ЗА ПАЛІВА

У Хоцімскім раёне склалася цяжкае становішча на жніве. Дажынкі тут справілі толькі ў калгасе "Кастрычнік". "Хоць і надвор'е не перашкаджае, аднак не хапае паліва, асабліва бензіну. Мала таго, што грошай няма ў калгасаў і саўгасаў, дык яшчэ і за грошы набыць "харч" для тэхнікі няма дзе. На бліжэйшых базах паліва — дэфіцыт, — сказаў у гутарцы Віктар Грэсеў, начальнік упраўлення райсельгасхарчу, — таму ў апошнія дні ўборка ў раёне замарудзілася".

**(Наш кар.)**

### СПРАВІЛІ ДАЖЫНКІ

Яшчэ ў пачатку мінулага тыдня хлебаробы СКП "Абухава" Гродзенскага раёна завяршылі жніво. Па апошніх звестках сярэдняя ўраджайнасць тут складае 46,3 цэнтнера з гектара. А на сённяшні дзень дажынкі справілі земляробы гэтага раёна з гаспадарак "Прагрэс", "Кастрычнік", "Свіслач", імя Дзеншчыкова.

Больш усіх намалаціў зерня (758 тон) камбайнер Сяргей Дзінкевіч са сваім памочнікам Яўгенам Карпавым з "Абухава" на Гомельскім КЗР-10.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

### ДЗЯРЖАЎНЫЯ ЗАСЕКІ НЕ ХУТКА НАПАЎНЯЮЦЦА

Па звестках камітэта па хлебапрадуктах гаспадаркі краіны здаюць збожжа дзяржаве вельмі неахвотна. Па стану на 3 ліпеня было нарыхтавана ўсяго 310 тысяч тон збожжа, або каля 20% запланаванага.

Больш за ўсіх здала зерня Гродзеншчына. Менш за ўсіх пакaзчыкі ў Гомельшчыны.

### ПРАДУКТЫ СТАЛІ ДЭФІЦЫТАМ

***(З выступлення дэпутата Хоцімскага раённага Савета дэпутатаў галоўнага рэдактара раённай газеты "Шлях Кастрычніка" Д.Я.Лапцеўскага на сесіі райсавета, што нядаўна адбылася).***

"Пытанне аб гандлі, напэўна, самае актуальнае на сённяшні дзень і на дзень будучы. Тут варта глядзець яшчэ глыбей: чым гандляваць? У прадуктовых магазінах акрамя счарнелых касцей і каўбасы ў мільён за кілаграм нічога няма. Знік тавар.

Мне здаецца, што прамысловых тавараў у нас хапае, абы грошы былі. А вось прадуктаў харчавання няма і, здаецца, што не будзе. Для таго і сённяшняя сесія, каб выпрацаваць тактыку і стратэгію забеспячэння насельніцтва хлебам, мясам, малаком, макаронамі, крупамі.

У магазінах, асабліва ў райцэнтры, у асартыменце добрыя цукеркі, апельсіны, марожанае, шампанскае, шакалад. У прамтаварных — шыкарны абутак, касцюмы, сукенкі, веласіпеды і матацыклы, парфума і шмат іншых тавараў. Аднак, як глянеш на цану — галава пачынае кружыцца, глядзі ўпадзеш у обмарак".

### ХТО СЁННЯ ЗА "РЫСАЙ"?

Па звестках Міністэрства працы мінімальны спажывецкі бюджэт (у цэнах чэрвеня) складае 15 мільёнаў 892 тысячы рублёў на чалавека. Такім чынам, "сярэдняй" беларускай сям'і з 4-х чалавек трэба мець даходу 63 мільёны 568 тысяч рублёў у месяц. А ці кожная сям'я, нават калі бацька і маці абодва працуюць, мае такі даход? Калі ж даход меншы за 15 мільёнаў 892 тысячы рублёў на душу — сям'я ўжо, лічы, за рысай беднасці.

Хто ж колькі сёння зарабляе ў Беларусі "У сярэднім"? Вось які малюнак за чэрвень: работнікі прамысловасці — 20 мільёнаў 340 тысяч рублёў, будаўніцтва — 22 мільёны 81 тысяча, чыгуначнага транспарту — 17 мільёнаў 231 тысяча, паветранага — 24 млн. 499 тыс., лясной гаспадаркі — 16 млн. 835 тыс., сувязі — 16 млн. 818 тыс., у гандлі — 13 млн. 896 тыс., у саўгасах — 11 млн. 259 тыс., у калгасах — 9 млн. 403 тыс.

Як бачым, у вытворчай сферы жабрацкія заробкі ў тых, хто ўсіх нас корміць — у сялян, калгаснікаў ды рабочых саўгасаў. "Чырвоныя" ж "ламешчыкі" атрымліваюць нядрэнна. А вось якія заробкі ў невытворчай сферы. Работнікі банкаў — 41 млн. 338 тыс., судовыя і юрыдычныя ўстановы — 24 млн. 665 тыс., апарат органаў гаспадарчага кіравання — 30 млн. 477 тыс., навука і навуковае абслугоўванне — 20 млн., 452 тыс., жыллёва-камунальная гаспадарка — 17 млн. 630 тыс., ахова здароўя — 16 млн. 118 тыс., сістэма адукацыі — 15 млн. 636 тыс., фізкультуры і спорту — 15 млн. 234 тыс., страхавання — 15 млн. 1 тыс., культуры 13 млн. 890 тыс., мастацтва — 12 млн. 884 тыс., сацыяльнага забеспячэння — 10 млн. 929 тыс. рублёў. Апошнія, як бачым, такія ж жабракі, як сяляне.

А есці ж усім аднолькава хочацца. І адзявацца кожнаму трэба.

Калі добра прыгледзецца і прааналізаваць заробкі пералічаных катэгорый работнікаў, то вынікае, што той, хто больш за ўсіх працуе, укалвае, той менш за ўсіх зарабляе.

І праўда, як той казаў-жартаваў: навошта многа грошай таму хто ў поце твару яшчэ з ранку да вечара — яму няма калі іх расходваць. Многа грошай трэба лайдаку. У яго часу шмат і ён адзін за дзесяцярых можа патраціць "бабак".

### ПРАФСАЮЗЫ — ЗА ПАВЕЛІЧЭННЕ ЗАРОБКАЎ

Федэрацыя прафсаюзаў зноў выступіла з прапановай павялічыць тарыфную стаўку першага разраду, прычым ужо з 1 верасня.

Сумнявацца ў неабходнасці гэтага бадай што ніхто не стане. Бо пасля апошняга змянення тарыфных ставак адбыўся значны рост цэн амаль на ўсе спажывецкія тавары і паслугі. За май ён склаў 8,9 %, за чэрвень 7,1% і ўжо за першыя тры тыдні ліпеня — 4,4%.

Па прагнозах прафсаюза ў гэтым месяцы і асабліва ў верасні інфляцыя яшчэ больш узрасце, што прывядзе да яшчэ большага падзення ўзроўню жыцця большасці грамадзян краіны.

Паколькі ў Беларусі выкананне даходнай часткі бюджэту ідзе з перавышэннем, гэтыя грошы Ураду і трэба аддаць на павышэнне заробкаў і не знаходзіць нейкую прорву, куды б іх "укінуць".

**(Наш кар.)**

### СЛЕДЧЫ-ХАБАРНІК

Пракуратурай Віцебскай вобласці ўзбуджана крымінальная справа ў адносінах да следчага аднаго з раённых аддзелаў міліцыі за атрыманне хабару ў суме 170 долараў ЗША. Гэтыя грошы былі перададзены следчаму ў кафэ ўніверсама абвінавачваемым па справе за спыненне ў адносінах да яго крымінальнай справы.

### ІНШАМАРКА ДЛЯ БАНКІРА

Пракуратурай г. Полацка завершана следства і крымінальная справа накіравана ў суд у адносінах да дваіх былых кіраўнікоў Полацкага аддзялення "Белпрамбудбанка", якія ў 1994—99 гадах незаконна выдалі прыватнаму прадпрымальніку крэдыты ў суме 60 тысяч долараў ЗША, якія не былі вернуты. Прадпрымальнік за аказаную паслугу "падарыў" ім аўтамашыну "Аўдзі-100" і больш як 2 тысячы долараў ЗША. Меру пакарання за ўчыненае былымі банкірамі вызначыць суд.

**Аляксей ТАРАНАЎ, прэсцэнтр пракуратуры РБ**

### СПРОБА ЎКРАСЦІ ПА-БАБРУЙСКУ...

Адна жыхарка Бабруйска, прайшоўшы "універсітэты" ў краях не вельмі аддаленых, улічваючы набыты раней вопыт, рашылася правесці даволі буйную аферу. Знайшла сабе і "напарніцу" для ажыццяўлення крымінальнага праекта.

Абедзве жанчыны не толькі былі "не лыкам шытыя", але і выдзяляліся ў грамадскім жыцці знакамітага горада. Раней судзімая грамадзянка працавала дырэктарам арэндна-гандлёвага прадпрыемства "Хімбыт", а саўдзельніца, якая ўпершыню сутыкнулася з Фемідай, з'яўлялася галоўным бухгалтарам Бабруйскай аўташколы. Мабыць, нейкае дачыненне да грашовых спраў і справакавала жанчын на адчайны крок: яны аблюбавалі бабруйскае аддзяленне "Беларускага біржавага банка", дзе хутка і з'явіліся з паперамі на атрыманне крэдыту. Зразумела, аперацыя не была б аферай, калі б даныя, якія мелі значэнне для атрымання крэдыту ў суме 2 мільярдаў рублёў, не з'яўляліся фальшыўкай. Праўда план "дуэта" праваліўся. А ў жанчын па прыгавору суда цяпер досыць часу, каб правесці "работу над памылкамі".

**Ігар ГРЫШЫН.**



Хто мацнейшы. Фота В. БЫСАВА

### ЗАСТРЭЛЕНЫ ПРЭЗІДЭНТ БФК

Трэцяга ліпеня дзесьці каля паўночы ў двары аднаго з дамоў па Партызанскаму праспекту ў Мінску быў знойдзены труп. Загінуўшым аказаўся прэзідэнт Беларускай Федэрацыі Каратэ Сяргей Волчак. Ён быў забіты з агнястрэльнай зброі. У яго цела трапілі чатыры кулі.

Па факту забойства пракуратурай Партызанскага раёна г. Мінска ўзбуджана крымінальная справа.

**Вольга РАМАНЮК.**

### ЗАЦВЕРДЖАНЫ БЮДЖЭТ ПРАЖЫТАЧНАГА МІНІМУМУ Ў БЕЛАРУСІ

Прэм'ер-міністр Сяргей Лінг 2 жніўня падпісаў пастанову "Аб зацвярджэнні бюджэту пражытачнага мінімуму у сярэднім на душу насельніцтва і па асноўных сацыяльна-дэмаграфічных групах у цэнах чэрвеня 1999 года".

Цяпер у разліку на месяц ён будзе складаць у рублях у сярэднім на душу насельніцтва — 10718631, для працаздольнага насельніцтва — 11345737, для пенсіянераў — 8624146, для студэнтаў — 11129838, для дзяцей ва ўзросце ад 2 да 16 гадоў — 11349077, для дзяцей ва ўзросце да 3 гадоў — 8050147 рублёў.

### НА БЕЛАРУСІ СЁЛЕТА ПАТАНУЛІ БОЛЬШ 1000 ЧАЛАВЕК

На рэках і вадаёмах рэспублікі сёлетні купальны сезон стаў самым "крывавым" у гісторыі Беларусі. Толькі за два летнія месяцы — чэрвень і ліпень — у краіне патанула 734 чалавекі, 97 з якіх — дзеці. Самым страшэнным быў для купальшчыкаў чэрвень — 542 загінуўшых, самыя "чорныя" дні — 12 і 13 чэрвеня. Тады за 2 дні патанулі 64 чалавекі.

Асноўныя прычыны гібелі — неасцярожнасць і грэбаванне правіламі бяспекі паводзінаў на вадзе. Усяго ж з пачатку года ў вадзе загінулі 1086 чалавек, з якіх 136 дзетак.

**Сяргей КУРКАЧ.**

### ГІНУЦЬ СЯЛЯНЕ НА ПРАЦЫ

Паводле аператыўных даных Камітэта па інспекцыі працы, толькі за ліпень у аграпрамысловым комплексе краіны пры выкананні працоўных абавязкаў загінулі 18 і атрымалі цяжкія знявечанні 16 чалавек.

Адно параўнанне: за ліпень мінулага года на сваіх працоўных месцах цяжкія траўмы атрымалі 30 вяскоўцаў. Аднак загінулі менш — 10. Між тым, на думку галоўнага дзяржаўнага інспектара працы аддзела АПК Івана Мелянтовіча, большасць няшчасных здарэнняў можна было б прадухіліць. Бо амаль 60 працэнтаў ад агульнай колькасці выпадкаў вытворчага траўматызму маюць па сутнасці ўсяго тры прычыны — няспраўная тэхніка, адсутнасць практыкі навучання бяспечным прыёмам працы і допуск вадзіцеляў і трактарыстаў да работы без перадрэйсавай праверкі на ўжыванне спіртных напояў.

**Сяргей ГРЫБ.**

• ПАЛІТЫКА

## "ЗА" И "ПРОТИВ"

(В конце июля граждане республики, которые не согласны с решением референдума 1996 года, продлившего полномочия Президента Лукашенко до 2001 года, приняли участие в акциях, организованных оппозиционными политиками в Минске и некоторых крупных городах Беларуси. В Минске участие в акции приняло, по разным данным, от 3 до 5 тысяч человек. Для многих людей А.Г.Лукашенко с 21 июля сменил свой социальный статус, став обычным гражданином Республики Беларусь. Мнения большинства белорусов по отношению к данной акции разделились...)

### ВЛАСТЬ ОКАЗАЛАСЬ НА ВЫСОТЕ

"...Что может испытывать любой нормальный человек, глядя на клоунаду, устроенную оппозицией по поводу "окончания президентских полномочий Лукашенко?" Жалкое зрелище, разрекламированное на всю республику как "акция всеобщего неповиновения", собрало три тысячи "благодарных" зрителей, которые выкрикивали уже набившие оскомину лозунги, произносили "зачитанные до дыр" речи...

Я не в восторге от того, как мы живем сейчас, но, право же, если у белорусской оппозиции все свежие идеи выразились в разбрасывании навоза на ступенях здания Администрации Президента, то я отказываюсь от помощи таких "спасителей Отечества". Но больше всех насмешили "демократические лидеры". В итоге в очередной раз подтвердили, что никому, кроме себя, любимых, они не нужны.

Так что в данной ситуации если кто и оказался на высоте, так столь горячо нелюбимая оппозицией власть, которая отнеслась к акции именно так, как та того заслуживала: не обратила никакого внимания. К большому сожалению тех, кто так любит работать "на картинку" западных телекомпаний, показывающих злой белорусский ОМОН, попирающий права человека..."

**А.СЕНЬКОВИЧ, Минск.**

### ВЛАСТЬ ОПЯТЬ ОПОЗОРИЛАСЬ

"То, что Лукашенко перестал быть президентом хотя бы для 100.000 белорусов, уже можно считать первой серьезной победой всех демократических сил республики. Конечно, кто-то может возразить, что на Октябрьской площади собралось всего-то 5 тысяч. но ни для кого не секрет, что значительная часть населения уже давно игнорирует большинство акций, проводимых нынешней оппозицией. Прежде всего потому, что среди нынешних оппозиционных режиму вождей нет никого, кто мог бы внушать хоть какое-то доверие. Как только такие люди появятся, на площадь выйдут все, кого нынешнее положение вещей в республике абсолютно не устраивает, а таких, благодаря "отеческой заботе" властей, становится все больше и больше.

Кстати, власть, несмотря на то, что собравшиеся на Октябрьской площади вели себя в высшей степени корректно, умудрилась проявить свою сущность и на этот раз. Видимо, для того, чтобы многочисленные наряды милиции, собранные в районе Октябрьской площади, не чувствовали себя неудовлетворенными, более 50 человек все-таки задержали. А чего стоит "наезды" на редактора газеты "Имя" Ирину Халип, на которую уже и уголовное дело завести умудрились...

Впрочем, этому можно найти объяснение — власти чувствуют, что почва уходит у них из-под ног. И хотя г-н Лукашенко остается фактическим руководителем государства, он понимает, что это положение отнюдь не вечно...".

**С. РАДУШКО, Минск.**

• ЭКАНОМІКА

## ХОЦІМСКІ РАЁН У ПЕРШЫМ ПАЎГОДДЗІ

**ПРАМЫСЛОВАСЦЬ**

Вытворана прадукцыі (работ, паслуг) у дзеючых цэнах на 202618 мільёнаў рублёў. У супастаўных цэнах зніжэнне вытворчасці да ўзроўню мінулага года склала 2,8%.

У цэлым па раёну выпуск спажывецкіх тавараў знізіўся на 12,5%. У той жа час выпуск вытворчых тавараў узрос на 3,1%.

Сёлета вытворчасць цэльнамалочнай прадукцыі павялічылася на 44%, каўбасных вырабаў на 2,9%, кандытарскіх вырабаў на 30%, ільновалакна — на 54,3%.

**РАСЛІНАВОДСТВА.**

Па стану на 28 чэрвеня нарыхтавана 5562 тоны сена, насельніцтвам назапашана 1258 тон гэтага корму. Апрыходавана ў гаспадарках 12392 тоны сенажу.

**ЖЫВЁЛАГАДОЎЛЯ.**

Рэалізацыя жывёлы на мяса зменшылася на 484 цэнтнеры ці на 5%. Знізіліся на 15 г сярэднесутачныя прывагі БРЖ. Надоена малака на 10004 цэнтнеры (на 15%) менш. Сярэдні удой ад каровы паменшаў на 14,8%.

**ЗАКУПКІ**

Закупкі жывёлы і птушкі ва ўсіх катэгорыях гаспадарак сёлета склалі 528 тон супраць леташніх 706 т. Рэалізацыя жывёлы дзяржаве насельніцтвам склала 66 тон супраць 85 т. летась. Прададзена 4132 тоны малака — на 190 т. больш, чым летась. Насельніцтвам прададзена 663 тоны, што таксама больш леташняга.

**КАПІТАЛЬНАЕ БУДАЎНІЦТВА.**

Уведзена ў дзеянне на 76617 мільёнаў рублёў асноўных фондаў. Пры гэтым выкарыстана 106872 мільёны рублёў капітальных укладанняў, у тым ліку 88439 мільёнаў — на вытворчасць будаўніча-мантажных работ.

На будаўніцтва жылля калгасамі асвоена 34099 мільёнаў рублёў капіталаукладанняў, з іх 31687 мільёнаў — на будаўніча-мантажныя работы.

Індывідуальнымі забудоўшчыкамі пабудавана 15 дамоў агульнай жылоё плошчай 1334 квадратных метры.

**ФІНАНСЫ.**

Прадпрыемствамі і арганізацыямі, калгасамі і саўгасамі атрымана 3845 мільёнаў рублёў страт, а летась было прыбытку 5679 мільёнаў. Стратнымі сталі 12 суб'ектаў гаспадарання ці 36% ад іх агульнага ліку. Сума гэтых страт дасягнула 26930 мільёнаў рублёў.

Дэбіторская запазычанасць галінамі народнай гаспадаркі дасягнула 93490 мільёнаў руб., а крэдыторская —270576 млн.

**ПЛАТНЫЯ ПАСЛУГІ.**

Аказана насельніцтву платных паслуг на суму 16498,2 мільёна рублёў, гэта 78% леташняга у супастаўных цэнах. Паслуг бытавога характару насельніцтва атрымала на 3126,3 мільёна рублёў, што складае 58% да мінулагодняга.

**ГАНДАЛЬ.**

Рознічны тавараабарот, уключаючы грамадскае харчаванне, дасягнуў 344668 мільёнаў рублёў — 84,2% да узроўню мінулага года.

Прадпрыемствамі грамадскага харчавання рэалізавана прадукцыі на 29642 мільёны рублёў — 101,8% да мінугодняга узроўню.

Ад рэалізацыі алкагольных напояў выручана па раёну 63499 мільёнаў рублёў — у 3,2 раза больш леташняга.

На долю харчовых тавараў прыходзіцца 71% тавараабароту.

**ПРАЦА.**

Фонд зарплаты па раёну склаў 229504 мільёны рублёў. На аплату працы калгаснікаў прыходзіцца 24% яго, рабочых і служачых 79%.

Сярэднемесячны заробак па раёну склаў 6694 тысячы рубля. Ва ўсіх калгасах і саўгасах сярэднямесячныя заробкі ніжэй сярэднераённых. Па стану на 30 чэрвеня не было выплачана заробкаў 20846 мільёнаў рублёў. За май усе гаспадаркі мелі запазычанасць па заробках.

**НАСЕЛЬНІЦТВА.**

У раёне нарадзілася 69, памёрла 150 чалавек. Летась было адпаведна 85 і 133 чалавекі. У раён прыехалі 82 чалавекі, прычым у Хоцімск — 48 новых жыхароў, у вёскі — 34. Выехалі з раёна 73 чалавекі, у тым ліку з Хоцімска — 43, з вёсак — 30.

**ПРЫВАТЫЗАЦЫЯ.**

Грамадзянамі раёна у чэрвені прыватызавана 67 кватэр у дамах дзяржаўнага і грамадскага жыллёвага фонду, агульнай плошчай 3742 квадратных метры, супраць 20 кватэр у чэрвені 1998 года.

А усяго з моманту уводзення у дзеянне Закона аб прыватызацыі ва уласнасць грамадзян перайшло 1704 кватэры агульнай плошчай 105 тысяч квадратных метраў.

Ацэначны кошт прыватызаваных кватэр у чэрвені гэтага года склаў 356 млн. 219 тыс. рублёў.

**Мікалай ТАРАСАЎ, начальнік раённага аддзела статыстыкі.**

## ЯК РАСІЯ І ГЕРМАНІЯ ДЗЯЛІЛІ БЕЛАРУСЬ

У сённяшняй гамонцы пра аб'яднанне з Расіяй, аб тым, якую нібыта вялікую карысць гэта прынясе Беларусі, "інтэгратары" чамусьці сарамліва замоўчваюць галоўнае, што мы ўсе, будучыня нашых дзяцей і ўнукаў, наша краіна ў чарговы раз сталі разменнай картай у гульні Масквы з Захадам.

У гісторыі Беларусі толькі на працягу XX стагоддзя адбылося дзевяць падзелаў ва ўгоду расійскай палітычнай каньюнктуры. Восем з іх правялі бальшавікі-камуністы з Масквы і адзін — фашысты з Берліна.

**1. Першая знявага адбылася 23 лютага 1918 года. Вось як гэта было.**

*Першы падзел Беларусі* адбыўся ў выніку змовы Расійскага ленінскага ўраду (які імкнуўся ўсімі сродкамі ўтрымацца пры ўладзе) з германскім імперыялізмам. Прынятыя ў Петраградзе ў ноч з 23 на 24 лютага 1918 года нямецкія ўмовы мірнага дагавору, якія былі афіцыйна падпісаны ў Брэсце 3 сакавіка таго ж году і напярэдадні падзеі (разгон бальшавікамі і Усебеларускага з'езда) паказалі хлусьлівасць лозунгу аб праве нацый на самавызначэнне.

У выніку гэтага дагавору ад Беларусі былі адрэзаны землі на захад ад Друі — Пастаў — Ружанаў. Вільня, Ліда, Пружаны, Камянец і іншыя былі аддадзены Германіі. Варта звярнуць увагу дасціпнага чытача на дату 23 лютага 1918 года, якая праз дзесяцігоддзе стала сьвяткавацца як дзень Чырвонай Арміі, быццам бы ў гонар перамогі рабочых атрадаў над кайзераўцамі над Нарвай і Псковам. На самой справе, на той час аніякіх баёў не было: у гэтую ноч Ленін мітусьліва лётаў па кабінеце ў Смольным, чакаючы звестак ад кур'ера, якога накіраваў з пісьмовым пацьвярджэннем згоды аб прыняцці ўсіх нямецкіх умоваў міру, толькі б яны прыпынілі свой наступ на Петраград. Кур'ер праз лінію фронту быў пасланы таму, што германскае камандаванне наадрэз адмовілася прымаць бальшавіцкія тэлеграмы і запатрабавала афіцыйных адпаведных дакументаў. За гэтую лютаўскую ноч шпаркі на нагу кур'ер пабываў за лініяй фронту і выканаў даручэнне Леніна. Вось пры якіх абставінах быў спынены нямецкі наступ. Менавіта так выглядае гісторыя гэтага сьвята.

Такім чынам 23 лютага ўвайшло ў гісторыю Беларусі як пачатак серыі здрад Расіі ў адносінах да Беларусі, у выніку якіх "абкрамсалі" нашы землі з усіх бакоў і параздавалі ўсім суседзям.

*Наступныя "перадачы" беларускіх зямель* яскрава адлюстравалі тыя ж тэндэнцыі знявагі нацыянальных правоў і інтарэсаў нашага народу. У часы савецка-польскай вайны адбылося некалькі перадзелаў тэрыторыі Беларусі. Створаная па загаду Масквы альтэрнатыўная Беларускай Народнай Рэспубліцы БССР, ужо 7 студзеня была зменшана амаль на палову, калі ў аднабаковым парадку Віцебская, Магалёўская і Смаленская губерні былі аб'яўлены часткамі РСФСР, а рэшта БССР фактычна была скасавана шляхам стварэння ЛітБела. Варта адзначыць, што ва ўрадзе так званай Літоўска-Беларускай рэспублікі не было ніводнага беларуса.

**2. Як "сэрца" Заходняй Беларусі —Вільня аказалася літоўскім горадам?**

*Трэці і чацьвёрты падзелы* адбыліся летам 1920 года, калі Маскоўскі ўрад, імкнучыся прыцягнуць на свой бок маладыя Латвію і Літву, правільней — Летуву (Жмудзь), шчодра надаваў ім беларускія землі. Латвіі — часткі Віцебскай губерні (Дзьвінскі, Рэжыцкі, Люцынскі —сучасныя Даўгаўпілс, Рэзекне і Лузда — паветы). Летуве — разам з Віленшчынай, Гродзеншчыну, Браслаўшчыну і іншыя тэрыторыі поўначы Беларусі, амаль да Маладзечна. Апошні падзел не быў здзейснены цалкам, па незалежных ад Расійскага і Летувіскага бакоў прычынах, але рэцыдывы гэтага дагавору мы маем і сёння, калі ў пэўных сітуацыях нашы паўночныя суседзі апелююць да гэтага дагавору. Так, некалькі гадоў таму ў Вільні была выдадзена геаграфічная карта, на якой паказаны межы адпаведна з гэтым дагаворам. Увогуле, на іхнюю думку, уся тэрыторыя "ідэальнай" Летувы ўключае ў сябе землі ад Браслава да Маладзечна і Баранавічаў, разам з Брэстам і Беластокам.

*Пяты падзел* быў здзейснены ў выніку Расійска-Польскага дагавору, які быў заключаны ў Рызе ў 1921 годзе. Адпаведна Масква перадала Варшаве заходнія землі Беларусі і дзяржаўная мяжа пралягла ў 40 км ад Мінска — першы пагранічны пункт —Негарэлае.

Увогуле гэты дагавор прывёў да фактычнага існавання БССР на плошчы крыху большай, чым 52 тысячы вёрст з насельніцтвам ад 1,3 да 1,6 млн. чалавек (нагадаем, што па Карскаму, беларусаў было 8 мільёнаў, паводле бальшавіцкіх адвозваў канца 1918 —пачатку 1919 гадоў — 12 мільёнаў, паводле іншых крыніцаў — 15 мільёнаў чалавек).

Такая дыспрапорцыя і актыўная антырасійская пазіцыя шэрагу беларускіх нацыянальна-вызваленчых арганізацый у Заходняй Беларусі вымусіла маскоўскія ўлады да пэўных крокаў, што прывяло да "узбуйнення" Беларусі ў 1924, 1926 гадах. У сувязі з гэтым варта падкрэсліць, што былі вернуты толькі некаторыя часткі былых Віцебскай і Магілёўскай губерніяў. "Па-за кадрам" засталіся Вяліжскі, Невельскі, Себежскі паветы, заходнія паветы Смаленскай губерні, разам з гарадам, і шэраг іншых, якія ўваходзілі ў БССР адпаведна з пастановай ад 31 сьнежня 1918 года — 1 студзеня 1919 года.

Падзеі 1939 года прывялі да ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР, але ў гэты ж час адбыўся *шосты падзел*, калі ў адпаведнасці з Маскоўска-Ковенскім дагаворам ад 7 кастрычніка 1939 года "сэрца Заходняе Беларусі" — Вільня —разам з Віленшчынай былі перададзены Летувіскай Рэспубліцы. Такім чынам, дзякуючы пакту Молатава-Рыбентропа Летува хоць і трапіла ў агульна-савецкі кацёл, але выскачыла адтуль з салідным "прываркам" у выглядзе Вільні і не толькі...

*Сёмы падзел* быў зроблены ў 1940 годзе, калі па загаду з Масквы ад Беларусі былі забраны на карысць Літвы Свянцяны, Салечнікі і Друскенікі (апошняя ўвогуле ніколі адміністрацыйна не ўваходзілі ў склад Віленшчыны, а спрадвеку знаходзіліся ў Гродзенскім павеце). Зараз гэтыя населеныя пункты называюцца Швянчоніс, Шальчынінкай і Друскенінкай.

*Восьмы падзел* адбыўся ў 1941—1944 гадах, калі нямецкі акупацыйны ўрад фактычна пацвердзіў перадачу шэрагу паўночных земляў Беларусі Літве.

**3.Беласток, Гадуцішкіе... Што далей?**

*Дзевяты падзел* адбыўся ў 1944—1950 гг., калі на карысць Польшчы Маскавой былі перададзены заходнія землі Беларусі — Беласточчына, а таксама шэраг тэрыторый Гродзенскай вобласці.

Такім чынам, толькі за перыяд з 1918 па 1950 гг. маскоўскі ўрад восем разоў здраджваў нашым нацыянальным інтарэсам, наносіў надзвычайную шкоду Беларусі.

Факты, якія я прывёў, сведчаць аб тым, як "улічваліся" сталіцай імперыі нашы нацыянальныя інтарэсы і дзеля чаго мы ім патрэбныя. Як рэцыдыў гэтых падзеяў можна нагадаць і тое, як у новыя часы Маскоўскае чыгуначнае ведамства далучылі да складу Прыбалтыйскай чыгункі станцыю Гадуцішкі, што прывяло да таго, што ад Беларусі зноў адшчыпнулі кавалак зямлі.

Аб усіх гэтых фактах афіцыйная прапаганда сціпла маўчыць. І вядома чаму: як гэта можна падвесці вялікага суседа! Праводзіцца палітыка забесьпячэння інтарэсаў Масквы, а зусім не нашых.

Што тычыцца славянскага братэрства, дык у нас сярод братоў не толькі рускія, але і украінцы, і палякі, і чэхі, і славакі, і сербы, і харваты, і балгары... Пры гэтым варта памятаць, што з Расіяй мы "пабраталіся" канчаткова толькі дзвесце год таму (1795 г.). Да гэтага мы жылі ў іншай краіне, разам з украінцамі і палякамі, паміж іншым звыш чатырох сотняў гадоў афіцыйна (з 1385 года). У Расійскую імперыю мы трапілі праз увод ёю сваіх войскаў на нашу зямлю (скажыце, што гэта за брат, калі прыходзіць да брата са зброяй?).

Дык як можна аб'ядноўвацца з тым, хто на працягу 80 гадоў падвёў цябе восем разоў?

А каб ідэалагічныя цэнзары не папракнулі мяне ў тым, што я быццам бы заклікаю да перагляду межаў з суседнімі дзяржавамі і тым самым хачу распаліць міждзяржаўны канфлікт, тройчы падкрэслю: ёсць Хельсінскае пагадненьне, і мы, беларусы, цьвёрда прытрымліваемся яго. Але ж і гісторыю хочам ведаць такой, якой яна была на самой справе. З тым, каб сёння, вяртаючыся да яе, рабіць правільныя вывады.

**Анатоль ЦІТОЎ.**

# Программа телевидения

## ПОНЕДЕЛЬНИК, 16 августа

**БТ**

6.30, 7.10 Доброе утро, Беларусь!
7.00, 9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 0.00 Новости.
8.15 Резонанс.
9.10 Потребительская корзина.
9.25 "Сегодня с вами..."
9.50 Здоровье.
10.15 "Сказка о Рыбке".
11.10 Новые имена.
11.20 "Верность любви".
12.05 Теленавигатор.
12.25 Музыка без границ.
13.15 Док.фильм .
13.45 Худ. фильм "На исходе лета".
15.15 "Девочка и океан".
15.40 Симфония N2.
16.35 Авто-парк.
16.45 Премьера песни.
17.15 "А музыка звучит..."
17.50 Телеочерк.
18.10 "Верность любви".
18.50 Новые имена.
19.15 Политические диалоги.
19.40 Спорт.
20.00 Добрый вечер, Беларусь!
20.25 "Понедельник с "Христофором".
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.40 Событие.
22.00 Худ.фильм "Душечка".
23.20 Криминальная хроника.
23.25 Белорусский хит-парад.
23.30 Третий тайм.
0.10 Крок.

**ОРТ**

14.00, 17.00, 23.15 Новости.
14.15 "Гарри — снежный человек".
14.40 Мультсеанс.
14.55 Звездный час.
15.30 ...До шестнадцати и старше.
16.00 "Во имя любви".
17.15 "Ералаш".
17.40 Программа "Мы".
18.20 Здесь и сейчас.
18.40 Худ. фильм "Молодая Екатерина". 1-я серия.
19.45 Спокойной ночи, малыши!
20.00 Время.
20.40 Однако.
20.50 "Горец - IV".
21.50 Взгляд.
22.35 Хоккей. Кубок "Спартака".

**"РОССИЯ"**

6.00 Доброе утро, Россия.
9.10 "Миледи".
10.00, 16.00, 19.00, 23.00 Вести.
15.30 "Первые поцелуи".
16.30 "Башня".
17.00 "Лето нашей тайны ".
18.00 Дежурная часть.
18.30 Почта РТР.
19.40 Подробности.
19.55 Комедия "Девушка с гитарой".
21.40 Акуна матата.
22.45 Дежурная часть.
23.30 Автомотоспорт.

**"КУЛЬТУРА"**

7.05, 11.30, 13.30, 19.30, 23.00 Новости культуры .
7.25 "Вероника возвращается". Худ. фильм.
8.45 "Книжный кладезь".
8.55 "Секретный агент". Худ. фильм. Режиссер А.Хичкок.
10.25 "Мировая деревня".
11.10 "Время,портреты,судьбы". В.Даль.
11.40 После новостей....
12.00 Андрей Житинкин. Скандальный режиссер.
13.45 "Консилиум".
14.10 "Пушкинская тропа".
14.30 "Страна Фестивалия".
15.00, 17.30 Новости.
15.10 "Лукоморье".
15.30 Мультфильмы.
16.05 "Молитва". Док. фильм.
16.35 "15-й подъезд".
17.00 "Мир авиации".
17.40 , 20.10 "Горе от ума".
19.00 Мультфильм.
19.10 Чудо-сказка.
19.50 После новостей....
21.50 "Все, что смогу, спою..." Андрей Миронов.
22.45 "Pro memoria".

**НТВ**

6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00 "Сегодня утром".
7.35 Я — телохранитель.
8.10 "Она написала убийство".
9.00, 11.00, 13.00, 15.00 Сегодня.
9.20 "Чистосердечное признание".
9.45 Своя игра.
10.15 Мультфильм "Шарман, шарман!"
10.25 Дог-шоу "Я и моя собака".
11.30 А. Кторов и И. Ильинский в фильме "Праздник святого Йоргена".
13.35 Добро пожаловать!
14.20 Сегоднячко.
15.30 "Захватчики".
16.25 Впрок.
16.50 "Любовь и тайны Сансет Бич".

**"МОГИЛЕВ-1" на БТ**

13.45 Пунктир.
14.15 Телелоцман.
14.35 Мультфильм.

**"МОГИЛЕВ-1"**

17.30 "Солдат удачи, ЛТД": спецназ".
18.20 Мультфильмы.
18.40 Бобруйский вариант.
19.00 Тяжелый день.
19.30 Праздник в вашем доме.
20.20 Телемагазин.
20.30 День области.
20.50 Астро-дайджест.
21.00 Праздник в вашем доме.
21.35 "Не было печали". Худ. фильм.
22.45 День области.
22.55 "Бульвар". Крим. драма.

## ВТОРНИК, 17 августа

**БТ**

6.30, 7.10 Доброе утро, Беларусь!
7.00, 9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 0.00 Новости.
8.15 Политические диалоги.
8.40 Потребительская корзина.
9.15 "Синяя Свита". Сказка.
10.15 "Академия наук".
10.30 "Сегодня с вами..."
11.10 Новые имена.
11.20 "Верность любви".
12.05 Третий тайм.
12.35 "А музыка звучит..."
13.15 "Скрипка любви". Телеспектакль.
13.35 "Универсиада-99".
14.15 Туробъектив.
14.35 Бездельник.
15.15 "Девочка и океан".
15.40 Мультфильмы.
16.25 Телеочерк.
17.15 Уроки Н.Новожиловой.
17.40 Гости в дом.
18.10 "Верность любви".
18.50 Новые имена.
19.15 Прямая линия.
19.55 Спорт.
20.15 Добрый вечер, Беларусь!
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.40 Событие.
22.00 Худ.фильм "Хроника ночи".
23.20 Криминальная хроника.
23.25 Белорусский хит-парад.
23.30 "Джаз в ночи".

**ОРТ**

8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 23.10 Новости.
8.15 "Во имя любви".
10.15 Домашняя библиотека.
10.25 Смехопанорама.
13.30 Программа "Вместе".
14.15 "Гарри — снежный человек".
14.40 Мультсеанс.
14.45 Счастливый случай.
15.30 ...До шестнадцати и старше.
16.00 "Во имя любви".
17.15 "Каламбур".
17.40 Тема.
18.20 Здесь и сейчас.
18.40 "Молодая Екатерина".
19.45 Спокойной ночи, малыши!
20.00 Время.
20.40 Однако.
20.50 Худ. фильм "Ко мне, Мухтар!"
22.25 Поет Т. Овсиенко.
23.25 "Пятница,13-е".

**"РОССИЯ"**

6.00 Доброе утро, Россия.
9.00 Короткометражные худ. фильмы.
10.00, 16.00, 19.00, 23.00 Вести.
15.30 "Первые поцелуи".
16.30 "Башня".
17.00 "Лето нашей тайны".
17.55 "Окно в Европу-99".
18.25 Любовь с первого взгляда.
19.40 Подробности.
19.55 Д. Бернхард в боевике "Один против Якудзы".
21.40 Урмас Отт с...
22.45 Дежурная часть.
23.30 Мастер-ралли-99.
0.00 Магазин на диване.

**"КУЛЬТУРА"**

7.05, 11.30, 13.30, 19.30, 23.00 Новости культуры.
7.25 "Разбитая чашка от Кузнецова".
8.10 А.С.Пушкин. "Медный всадник".
9.00 "Седьмая пуля". Худ. фильм.
10.20 "Какой молодец этот Зощенко."
11.00 "Мир авиации".
11.40 После новостей....
12.00 "Вместо экзамена".
12.30 "Под сенью дружных муз".
12.50 "Российский курьер".
13.45 Памяти Веры Марецкой.
14.25 "История русской усадьбы". "Грот в Кускове".
15.00, 17.30 Новости.
15.10 "Лукоморье".
15.30 Мультфильмы.
16.00 Док. фильм.
16.20 "Дом актера". Часть 1-я.
16.45 А.С. Пушкин. "Скупой рыцарь".
17.15 "Ортодокс".
17.40 "Ноу-хау".
17.50 "Мой тяжкий крест".
18.45 Вечер В. Гаврилина.
19.15 Чудо-сказка.
19.50 После новостей....
20.10 Док. фильм.
20.15 Музыкальный экспромт.
21.15 "Седьмая пуля". Худ. фильм.
22.35 "Театр моей памяти".

**НТВ**

6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00 "Сегодня утром".
7.35 Я — телохранитель.
8.10 "Солдаты удачи".
9.00, 11.00, 13.00, 15.00 Сегодня.
9.20 Детектив "Противостояние". 4-я серия.
10.30 Домашний театр.
10.45 Мультфильм.
11.30 М. Яншин и Э. Гарин в фильме "Поручик Киже".
13.30 "Доктор Куин, женщина-врач".
14.20 Сегоднячко.
15.30 "Захватчики".
16.25 Впрок.
16.50 "Любовь и тайны Сансет Бич".

**"МОГИЛЕВ-1" на БТ**

13.35 Тяжелый день.
14.00 Бобруйский вариант.
14.20 Мультфильм.

**"МОГИЛЕВ-1"**

17.30 Солдат удачи, ЛТД: спецназ".Телесериал.
18.15 Катастрофы.
18.40 "Мода от "Том Клайм" в Могилеве".
19.00 Служба ваших забот.В студии генеральный директор ПО "Могилевнефтепродукт" А.Чечора.
19.35 Праздник в вашем доме.
20.20 Телемагазин.
20.30 День области.
20.50 Астро-дайджест.
21.00 Праздник в вашем доме.
21.35 "Трын-трава". Комедия.
23.05 День области.
23.15 "Мораль Рут Хальбфас". Драма.

## СРЕДА, 18 августа

**БТ**

6.30, 7.10 Доброе утро, Беларусь!
7.00, 9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 19.45, 0.15 Новости.
8.00 "Алло, "Событие".
8.40 Потребительская корзина.
9.10 "Иванко и царь Поганин". Худ. фильм.
10.30 "Я рисую".
10.45 Мультфильм.
11.10 Новые имена.
11.20 "Верность любви".
12.05 Компьютерный полигон.
12.25 "Зорная ростань".
13.15 Видимо-невидимо.
14.25 Ток-шоу "Карамболь".
15.15 "Девочка и океан".
15.40 Мультфильмы.
16.20 "Дзе - Я?" Памяти режиссера Николая Трухана.
17.10 "А музыка звучит..."
17.35 "Судьба моя и надежда".
18.05 "Верность любви".
18.45 Новые имена.
18.55 Футбол. Товарищеская встреча. Сборная Беларуси — сборная России.
21.00 Панорама.
21.40 Событие.
22.00 Худ.фильм "Осенняя дорога к маме".
22.40 Футбол. Чемпионат Европы среди молодежи.
23.35 Королевская охота.
0.05 Криминальная хроника.
0.10 Белорусский хит-парад.
0.25 Темная комната.

**ОРТ**

8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 23.20 Новости.
8.15 "Во имя любви".
9.15 Джентльмен-шоу.
9.40 Домашняя библиотека.
9.50 "Звездные воины".
10.40 Мультсеанс.
13.30 Программа "Вместе".
14.15 "Гарри — снежный человек".
14.45 Классная компания.
15.00 Зов джунглей.
15.30 ...До шестнадцати и старше.
16.00 "Во имя любви".
17.15 Лучшие из лучших.
17.35 Человек и закон.
18.15 Здесь и сейчас.
18.35 "Молодая Екатерина".
19.45 Спокойной ночи, малыши!
20.00 Время.
20.40 Однако.
20.50 Хит сезона. Мелодрама "Честная куртизанка".
22.50 "Собрание заблуждений".
23.35 Сериал "Пятница, 13-е".

**"РОССИЯ"**

6.00 Доброе утро, Россия.
9.10 "Миледи".
10.00, 16.00, 19.00, 23.35 Вести.
15.30 "Позвоните Кузе!"
16.30 "Башня".
17.00 "Лето нашей тайны".
17.55 "Москва — Улан-Батор. Что впереди?" Док. фильм.
18.25 "Аншлаг" представляет.
19.40 Подробности.
19.55 Худ. фильм "Свой среди чужих, чужой среди своих".
21.45 Концерт-акция.
23.20 Дежурная часть.
0.05 Автошоу.
0.35 Магазин на диване.

**"КУЛЬТУРА"**

9.05 "Триптих". Худ. фильм.
10.20 Э.Григ. Соната №3 для скрипки и фортепиано до минор.
10.35 "И представление продолжается..." Док. фильм.
11.30, 13.30, 19.30, 23.00 Новости культуры.
11.40 После новостей....
